УДК 811.161.3’355(043.3)

**В. А. Мандзік**
Нацыянальная акадэмія навук Беларусі

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫМАЎЛЕННЯ КАНСАНАНТНЫХ СПАЛУЧЭННЯЎ З ПАЧАТКОВЫМІ ЗВОНКІМІ ЗМЫЧНЫМІ НА САНДХІЯЛЬНЫХ МЕЖАХ КАМПАЗІТАЎ І СЛОЎ З ПАБОЧНЫМ НАЦІСКАМ

Артыкул прысвечаны вывучэнню фанетычнай арганізацыі кансанантных спалучэнняў з пачатковымі звонкімі змычнымі гукамі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Даследаванне праведзена на аснове 34 спецыяльна адабраных лексічных адзінак – кампазітаў і слоў з пабочным націскам. Выбраны лексічны матэрыял дэманструе ўсе магчымыя выпадкі спалучэння звонкіх змычных [б], [д] з наступнымі звонкімі, санорнымі і глухімі зычнымі ў становішчы сандхі. У выніку яго начытвання 100 носьбітамі беларускай літаратурнай мовы атрымана 3400 арфаэпічных рэалізацый, якія падвергліся перцэптыўнаму аналізу і камп’ютарнай апрацоўцы. Інструментальная апрацоўка гукавых файлаў ажыццяўлялася з дапамогай прафесійнага аўдыярэдактара Sound Forge 7. Вывады пра асаблівасці рэалізацыі камбінаторных змен зычных зроблены на аснове слыхавога ўспрымання і даных акустычнага асцылаграфічнага аналізу (даўжыня гука і яго асобных сегментаў, структура гукавой хвалі).

Паказана залежнасць арфаэпічнай арганізацыі даследаваных кансанантных спалучэнняў ад фанетычных (фанетычнае акружэнне зычнага, наяўнасць на сандхіяльным стыку шматкампанентных кансанантных груп, не характэрных для фанетычнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы), граматычных (ступень члянімасці і спосаб утварэння слоў) і лексічных (ступень засвоенасці слоў і частотнасць іх ужывання) фактараў.

**Ключавыя словы:** кансанантызм, сандхі, асіміляцыя, фанетычная сістэма, акустычная структура, пабочны націск.

**V. A. Mandzik**
National Academy of Sciences of Belarus

# FEATURES OF PRONUNCIATION OF CONSONANT COMBINATIONS WITH INITIAL VOICED STOP SOUNDS PRONUNCIATIONAT SANDHIAL INTERFACES OF COMPOSITES AND WORDS WITH THE SECONDARY ACCENT

The paper is dedicated to the research of consonant combinations with initial voiced stop sounds phonetic organization in the modern Belarusian standard language. The study was conducted on the basis of 34 specially selected lexical items – composites and words with the secondary accent.

Selected lexical material shows all the possible combinations cases of voiced stops [b], [d] with the following voiced, sonorous and voiceless consonants in the sandhi position. As results of its recitation by 100 native Belarusian standard speakers werereceiving 3400 orthoepical implementations subjected to the perceptual analysis and computer processing.

Audio files instrumental processing realized with the help of professional audio editor Sound Forge 7. Conclusions about the combinative consonants changes implementation features were made on the basis of aural sensing and acoustic oscillographic analysis data (sound and its individual segments length, the sound wave structure).

It is shown the studied consonant combinations orthoepic organization dependence from phonetic (consonant phonetic environment, availability on the sandhial junction of multicomponent consonant groups that are not specific for the Belarusian standard language phonetic system), grammar (dividedness degree and manner of production) and lexical (words development degree and its applications frequency) factors.

**Key words:** consonantism, sandhi, assimilation, phonetics, acoustic structure, secondary accent.

**Уводзіны.** У апошнія дзесяцігоддзі група лексем, утвораных па мадэлі складаных і складанаскарочаных слоў, значна папоўнілася за кошт асваення новых запазычанняў: *вэб-браўзер, дайв-клуб, картынг-хол, боўлінг-цэнтр, сэканд-хэнд, брэйк-біт, брэйк-данс, інтэрнэт-банкінг* і інш. Гэты клас слоў разам з лексемамі, якія з пункту погляду словаўтварэння не з’яўляюцца кампазітамі, але ў якіх пры маўленні можа ўзнікаць пабочны націск (тыпу *кліпмейкер*, *віндсёрфінг*, *экс-прэм’ер*), мае адметныя фанетычныя асаблівасці. Яны абумоўлены спецыфічным акцэнтна-рытмічным афармленнем, наяўнасцю сандхіяльнага стыку, які можа ўспрымацца носьбітамі мовы як унутрыслоўны ці як міжслоўны.

Фанетычная арганізацыя сандхіяльных стыкаў названых слоў у беларускай лінгвістыцы не станавілася аб'ектам асобных даследаванняў – ні тэарэтычных, ні эксперыментальных. У той жа час характэрныя для беларускай літаратурнай мовы асіміляцыйныя працэсы, што адбываюцца на марфемных швах, падрабязна апісаны ў лінгвістычнай літаратуры. У прыватнасці, адзін з раздзелаў фундаментальнага выдання «Фанетыка беларускай літаратурнай мовы» пад рэдакцыяй А. І. Падлужнага дае вычарпальныя звесткі пра спалучэнні гукаў у межах слова, у тым ліку на стыку марфем [1]. Тут прыведзены таксама некаторыя прыклады асіміляцыйных змяненняў па глухасці / звонкасці на мяжы састаўных частак складаных і складанаскарочаных слоў: *ту*[пс]*анаторый* (*тубсанаторый*), *шлю*[бб]*элька* (*шлюп-бэлька*), *ашча*[тк]*аса* (*ашчадкаса*), *спе*[дзγ]*ароднінагандаль* (*спецгароднінагандаль*). Аднак гэтыя звесткі сістэмна не адлюстроўваюць арфаэпічнай спецыфікі ні кампазітаў са славянскімі асновамі, ні, тым больш, з запазычанымі часткамі. Такім чынам, выяўляецца лакуна ў фанетычнай сістэме беларускай мовы. Яе запаўненне звязана як з выкананнем задач комплекснага сістэмнага апісання фанетычнага ўзроўню сучаснай беларускай літаратурнай мовы, так і з надзённымі патрэбамі арфаэпічнай кадыфікацыі, устанаўлення ўзаемаадносін «норма / узус».

Для выяўлення кансанантных спалучэнняў з пачатковымі звонкімі змычнымі, якія сустракаюцца на сандхіяльных межах у беларускай літаратурнай мове, быў даследаваны корпус акадэмічнага «Слоўніка беларускай мовы» [2]. З гэтай крыніцы адабрана 34 словы, якія дэманструюць тыповыя спалучэнні зычных, што тэарэтычна могуць падлягаць асіміляцыйным змяненням. Дадзены матэрыял быў прапанаваны для начыткі 100 носьбітам беларускай літаратурнай мовы. Інфармантамі ў дадзеным эксперыменце выступілі асобы, якія атрымліваюць / маюць вышэйшую філалагічную адукацыю і / або карыстаюцца беларускай мовай у сваёй прафесійнай дзейнасці: акцёры тэатра, дыктары радыё, студэнты і выкладчыкі філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў Мінска, пісьменнікі, навукоўцы, дзеячы культуры. У выніку атрымана 3400 арфаэпічных рэалізацый, якія падвергліся перцэптыўнаму аналізу і камп'ютарнай апрацоўцы. Інструментальная апрацоўка гукавых файлаў ажыццяўлялася з дапамогай прафесійнага аўдыярэдактара Sound Forge 7. Дадзены праграмны сродак прадастаўляе шэраг магчымасцей для сегментацыі гукавой плыні, маніпуляцый з гукам у мэтах праверкі гіпотэз, звязаных з арганізацыяй гукавой формы мовы, а таксама дазваляе стварыць ілюстраваны матэрыял для публікацыі вынікаў даследаванняў.

**Асноўная частка.** Аналіз слоўнікавага матэрыялу паказаў, што ў становішчы сандхі аказваюцца спалучэнні зычных, якія складаюцца з пачатковага **[б]** і наступных **звонкіх**: **б + б** (*вэб-браўзер*), **б + г** (*рыбгас*), **б + д** (*вэб-дызайн*); наступных **санорных**: **б + в** (*вэб-выданне*), **б + м** (*вэб-майстар*), **б + н** (*рыбнагляд*), **б + р** (*штаб-ротмістр*); наступных **глухіх**: **б + к** (*штаб-кватэра*), **б + п** (*вэб-праграміст*), **б + с** (*вэб-старонка*), **б + ц'** (*субцітр*). У першых дзвюх групах **[б]** аказваецца ў моцнай пазіцыі, у трэцяй – у слабай, якая прадугледжвае аглушэнне звонкага.

Пры слыхавым аналізе лексемы *вэб-браўзер*, вымаўленай інфармантамі злітна, спалучэнне **б + б** успрымаецца як падвоены **[б:]**, аналагічны фанеме, якая ўзнікае на стыку прыстаўкі і кораня, напрыклад, у слове *аббурыць*. На асцылаграме (мал. 1) дастаткова выразна відаць сегмент, які адпавядае звонкай змычцы, і невялікі ўчастак выбуху, што адрозніваецца большай амплітудай. Пры агульнай працягласці гука 250 мсек толькі 10 мсек прыпадае на выбух, 240 мсек гучыць звонкая змычка. Такое падаўжэнне дадзенага сегмента з'яўляецца характэрнай акустычнай прыкметай, дзякуючы якой зычны ўспрымаецца як падвоены.

Толькі трое інфармантаў са 100 рэалізавалі на месцы аналізуемага спалучэння звонкі змычны **[б]** без падваення; працягласць змычкі пры такім вымаўленні была прыкладна ў два разы карацейшай. Дадзены варыянт можна растлумачыць хуткім тэмпам вымаўлення, калі кансанантныя спалучэнні дзеля больш зручнай артыкуляцыі спрашчаюцца, рэдуцыруюцца.




Мал. 1. Асцылаграма слова *вэб-браўзер* з падоўжаным [б:]

Злітнае вымаўленне дадзенага слова было дамінуючым, аднак 11 інфармантаў рэалізавалі яго з паўзай. У гэтым выпадку канцавы **[б]** часткі *вэб-* аглушаецца, на яго месцы гучыць выбухны **[п]**. Абедзве часткі кампазіта адпаведна артыкулююцца як асобныя словы, камбінаторныя змяненні зычных на іх стыку не адбываюцца. Выбухны элемент канцавога **[п]** значна павялічваецца – да 55 мсек. Гэтая характэрная асаблівасць глухіх выбухных у дадзеным фанетычным становішчы была заўважана А. Падлужным: «У канцы слова, асабліва перад паўзай, пасля глухіх выбухных назіраецца ўчастак шуму з паступовым спадам амплітуды, які ўтвараецца за кошт прыдыхання. Паколькі гэты ўчастак адносіцца да выбухнога сегмента, даўжыня апошняга павялічваецца» [3, с. 57].

Для аналізу арфаэпічнай рэалізацыі ў сандхіяльным становішчы спалучэння «звонкі + звонкі» былі ўзяты лексемы *вэб-дызайн* і *рыбгас*. Рознае арфаграфічнае афармленне слоў (напісанне разам і праз злучок) істотна не паўплывала на злітнасць вымаўлення: зафіксавана пяць выпадкаў раздзельнага вымаўлення лексемы *вэб-дызайн* і адзін – кампазіта *рыбгас*. Для большасці інфармантаў характэрным з'яўляецца захаванне якасці **[б]** перад наступнымі **[д]** і **[γ]** (92% і 94% адпаведна).

Асцылаграфічны аналіз дае ўяўленне пра структуру звонкага выбухнога: невялікая па працягласці змычка і значна даўжэйшы выбух з больш шырокай амплітудай. Аднак нават пры злітным вымаўленні назіраліся нешматлікія выпадкі аглушэння. Так, для лексемы *рыбгас* яны былі зафіксаваны ў пяці выпадках. Ідэнтыфікацыйныя характарыстыкі ўтворанага на месцы арфаграфічнага *б* гука выяўляюцца на асцылаграме. На глухасць змычнага ўказвае працяглая (80 мсек) змычка з поўнай адсутнасцю сігналу і кароткі (10 мсек) выбух з невялікай амплітудай. Дыстрыбуцыйныя ўласцівасці звонкіх зычных у фанетычнай сістэме беларускай літаратурнай мовы прадугледжваюць іх спалучальнасць з наступнымі звонкімі, таму выяўленыя варыянты – з'ява пазасістэмная. Не выпадкова адзін з інфармантаў рэалізаваў аналізуемую лексему з двума глухімі – *[рыпха́с]*, што адпавядае правілам спалучальнасці гукаў, хоць і не адлюстроўвае адэкватны арфаэпічны воблік дадзенага канкрэтнага слова. Ігнараваць наяўнасць варыянтаў з аглушаным зычным на сандхіяльным стыку нельга, паколькі арфаэпічныя ўласцівасці складаных слоў могуць мець асаблівасці, адметныя ад агульнай фанетычнай сістэмы.

У адзіным выпадку раздзельнага вымаўлення слова *рыбгас* замест прагназаванага аглушэння перад паўзай **[б]** захоўвае сваю якасць. Відаць, гэта можна растлумачыць старанным, «звышлітаратурным» вымаўленнем інфарманта – прафесійнага акцёра, імкненнем найбольш выразна перадаць гукавую абалонку слова. Ва ўсіх пяці выпадках раздзельнага вымаўлення слова *вэб-дызайн* аглушэнне канцавога змычнага адбываецца. Выяўлены адзін выпадак вымаўлення **[п]** на месцы арфаграфічнага *б* і пры злітным вымаўленні. Параўнанне двух зычных у ідэнтычным фанетычным становішчы дазваляе адзін з іх аднесці да глухога (выбух нязначны па амплітудзе і даўжыні), другі – да звонкага (выбух больш працяглы, амплітуда шырэйшая). Аналіз іх графічнага вобліку цалкам супадае з дадзенымі аўдзіравання. Узнікненне падобных варыянтаў можа быць выклікана структурай кампазітаў, якая прадугледжвае магчымасць з'яўлення пабочнага націску на першай аснове і, адпаведна, больш адасобленага яе вымаўлення. Значна большая варыянтнасць назіраецца пры вымаўленні **[б]** перад наступнымі санорнымі. У беларускай фанетычнай сістэме шырока прадстаўлены як спалучэнні «глухі + санорны», так і спалучэнні «звонкі + санорны» (*ва**пн**а* і *пры**вабн**ы*), але спалучэнне *пм* ужываецца толькі ў запазычаных словах (*нэ**пм**ан*, *клі**пм**ейкер*). Таму на месцы этымалагічнага звонкага на канцы першай асновы незалежна ад графічнага адлюстравання слова сустракаюцца абодва варыянты рэалізацыі – і звонкі, і глухі. Так, пры злітным вымаўленні лексемы *вэб-майстар* зафіксавана 17 выпадкаў аглушэння змычнага перад санорным (17% ад 100 рэалізацый). Зычнаму **[п]** на асцылаграме адпавядае ўчастак з адсутнасцю сігналу – глухая змычка. Адсутнасць выбуху не перашкаджае ідэнтыфікацыі, бо ён «…як сегмент цалкам прадказваецца наяўнасцю змычкі, якая зусім абавязковая для дадзенага класа гукаў» [3, с. 57]. Зычнаму **[б]** таксама адпавядае звонкая змычка без выбуху з нязначнай у параўнанні з наступным санорным велічынёй амплітуды.

Падобныя рэзультаты і вымаўлення слова *рыбнагляд* – 15% рэалізацый аглушанага змычнага. Такім чынам, пры злітным вымаўленні частак кампазітаў дамінуе варыянт рэалізацыі перад санорным звонкага змычнага. Яго якасць добра вызначаецца на слых і пацвярджаецца данымі асцылаграфічнага аналізу. Звонкаму **[б]** адпавядае непрацяглая змычка (26 мсек), істотны па даўжыні выбух (33 мсек) і пэўны пераходны сегмент, які ўяўляе сабой крывую з больш простай у параўнанні з выбухам структурай (29 мсек). Яго наяўнасць выклікана ваганнямі галасавых звязак, калі перашкода ў поласці рота знікае і гукавая хваля можа вылучацца свабодна. Калі аднесці дадзены элемент да выбуху, што і рэкамендавана ў навуковай літаратуры, то працягласць апошняга павялічваец-

ца да 62 мсек. Гэта адназначна ўказвае на звонкую якасць змычнага.

Пры аналізе рэалізацыі лексемы *штаб-ротмістр* мы зафіксавалі значна большую ў параўнанні з папярэднімі кампазітамі колькасць выпадкаў раздзельнага вымаўлення – 16 са 100. Гэта можа быць выклікана нізкай частотнасцю ўжывання дадзенага слова ў штодзённым маўленні (а значыць, і нізкай ступенню яго асвоенасці), а таксама арфаэпічнымі складанасцямі другой часткі кампазіта. Тут маецца на ўвазе канцавое трохгукавое кансанантнае спалучэнне *стр*, якое ў 28% выпадкаў вымаўлялася з устаўным галосным пасля **[т]**. Пры гэтым канцавы змычны першай часткі пераважна аглушаўся, акрамя двух выпадкаў захавання этымалагічнай звонкасці.

Глухі змычны быў рэалізаваны інфармантамі і ў пераважнай большасці выпадкаў злітнага вымаўлення, зафіксавана толькі сем прыкладаў захавання этымалагічнай звонкасці **[б]**. На нашу думку, аглушэнне звязана з узнікненнем пры вымаўленні дадзенага слова пабочнага націску на першай аснове. Яго з'яўленне тут тлумачыцца хутчэй не акцэнтна-рытмічнымі, а семантычнымі фактарамі: прыналежнасць слова да спецыяльнай лексікі, магчымасць ужывання другой часткі самастойна, што павялічвае верагоднасць пастаноўкі пабочнага націску [1, с. 273]. У фанетычнай літаратуры адзначаецца, што наяўнасць або адсутнасць націску ці акцэнту на першай аснове ўплывае на шчыльнасць мяжы паміж асновамі: пры дадатковай акцэнтуацыі магчымасць з'яўлення арфаэпічных варыянтаў узрастае [4]. Гэтае назіранне, зробленае на аснове фанетычнага матэрыялу рускай мовы, аказваецца справядлівым і для ўзуальнай рэалізацыі сандхіяльных стыкаў у беларускім маўленні.

Праслухоўванне і камп'ютарны аналіз слоў, у якіх на сандхіяльных межах звонкі змычны **[б]** сутыкаецца з наступнымі глухімі, паказалі паслядоўнае дзеянне асіміляцыі па глухасці (100% рэалізацый). Даследаваныя кансанантныя спалучэнні шырока прадстаўлены ў пазіцыі ўнутранага сандхі – на мяжы прыстаўкі і кораня (а***бс***лугоўванне, абкантаваць, а***бц***ерці), кораня і суфікса (масларобства, выру***бк***а, ба***бц***ы). Лексема *штаб-кватэра* была вымаўлена з паўзай паміж часткамі толькі двума інфармантамі, канцавы зычны першай асновы пры гэтым аглушаўся. Ва ўсіх астатніх выпадках злітнага вымаўлення змычны **[б]** перад глухім **[к]** таксама рэалізаваўся як **[п]**.

Для лексемы *вэб-старонка* рэзультаты наступныя: злітнае вымаўленне суправаджалася стопрацэнтным аглушэннем, як і тры з чатырох выпадкаў вымаўлення з паўзай. Зафіксаваны адзін выпадак, калі ў канцы першай часткі кампазіта перад паўзай інфармант захоўвае этымалагічную звонкасць змычнага.

Паўзу паміж кампанентамі слова *субцітр* зрабіў толькі адзін інфармант. Злітнае вымаўленне рэалізавалася з аглушэннем (97%), акрамя двух выпадкаў. У адным з іх перад **[ц']** быў вымаўлены звонкі змычны, пра што сведчыць слыхавы аналіз і наяўнасць на асцылаграме звонкай змычкі працягласцю 88 мсек. У другім выпадку інфармант таксама рэалізаваў звонкі **[б]**, але пасля яго быў ужыты устаўны рэдукаваны галосны няпэўнага ўтварэння.

Больш разнастайнымі аказаліся варыянты вымаўлення лексемы *вэб-праграміст*. Па-першае, яе структура (шматскладовае слова з асноўным націскам на трэцім складзе другой асновы) і семантыка (магчымасць ужывання другой часткі самастойна) прадугледжваюць узнікненне пры маўленні пабочнага націску, што павышае верагоднасць адасобленага вымаўлення частак слова. Па-другое, кансанантная група *бпр* не з'яўляецца характэрнай для беларускай мовы, ужываецца на мяжы прыстаўкі і кораня ў абмежаванай колькасці слоў (напрыклад, *абпраменены*), а значыць, уяўляе для носьбіта мовы пэўную арфаэпічную цяжкасць. Было выяўлена 8 выпадкаў раздзельнага вымаўлення частак кампазіта (8% ад агульнай колькасці), з іх 2 выпадкі з захаваннем звонкасці **[б]**. Зафіксаваны таксама адзін варыянт, калі замест паўзы інфармант дадае ў слова рэдукаваны галосны, што спрыяе захаванню якасці канцавога змычнага першай часткі кампазіта. Пры злітным вымаўленні спалучэнне **[бп]** было рэалізавана трыма інфармантамі. У астатніх выпадках (88%) утвораныя на месцы арфаграфічнага *бп* зычныя можна класіфікаваць як падоўжаныя глухія змычныя **[п:]**. На асцылаграме ім адпавядае глухая змычка з сярэдняй працягласцю 116 мсек (ад 91 да 155). Пры гэтым сярэдняя працягласць змычнага **[п]** у слове *вэб-старонка* роўная 60 мсек. Трэба адзначыць, што пры даўжыні змычкі ад 91 да 104 мсек на слых было цяжка вызначыць, падоўжаны перад намі гук ці не.

На сандхіяльных стыках даследаваных слоў сустракаюцца кансанантныя спалучэнні **[д]** і наступных **звонкіх**: **д + б** (*разведбат*), **д + г** (*разведгрупа, бонд-гарантыя*), **д + з** (*разведзводка*); наступных **санорных**: **д + в** (*брандвахта, брэйд-вымпел*), **д + м** (*фельдмаршал, брэнд-менеджмент*), **д + н** (*рыбнагляд*); наступных **глухіх**: **д + к** (*медкамісія*), **д + п** (*медперсанал, гранд-прэмія*), **д + с** (*рэдсавет, фельдсувязь, брандспойт, віндсёрфінг*), **д + т** (*будтрэст*), **д + ф** (*бандфарміраванне*), **д + х** (*сэканд-хэнд*), **д + ц** (*разведцэнтр*), **д + ч** (*гранд-чэмпіён*), **д + ш** (*разведшкола, слайд-шоу*).

Лексема *разведбат* пераважнай большасцю інфармантаў была вымаўлена з захаваннем якасці звонкага **[д]** (85%), аднак зафіксавана

8 выпадкаў аглушэння. Нягледзячы на лексічную асвоенасць слова, сямёра інфармантаў вымавілі яго з паўзай паміж часткамі, у выніку чаго этымалагічны **[д]** быў рэалізаваны як **[т]**. Падобныя вынікі і для слова *разведгрупа*: 10 варыянтаў з глухім змычным на канцы першай асновы, але толькі два выпадкі раздзельнага вымаўлення. Як і прагназавалася, часта інфарманты рабілі паўзу паміж часткамі кампазіта *бонд-гарантыя* (слова аднасіцца да спецыяльнай лексікі, акрамя таго, арфаграфічна аформлена праз злучок). Зафіксавана 8 выпадкаў такога вымаўлення, з іх толькі адзін – з захаваннем звонкасці канцавога змычнага. Пры злітным вымаўленні 40% інфармантаў рэалізавалі глухі змычны **[т]**, 60% – этымалагічны **[д]**. Можна меркаваць, што аглушэнне зычнага звязана з тэндэнцыяй да ўзнікнення ў дадзеным слове пабочнага націску. Вынікі аналізу па слове *разведзводка* паказалі паслядоўнае захаванне звонкасці пры злітным вымаўленні: выпадкі з аглушэннем зафіксаваны толькі двойчы. Аднак пры гэтым некаторыя інфарманты (16%), асабліва з хуткім тэмпам маўлення, ужывалі замест спалучэння змычнага **[д]** з фрыкатыўным **[з]** афрыкату **[ʒ]**: *[раз’в’эʒвотка]*. На асцылаграме звонкую афрыкату можна пазнаць па больш кароткай змычцы (у сярэднім 45 мсек) у параўнанні са змычкай звонкага выбухнога (гл. мал. 2). Моўная сістэма такія спалучэнні не забараняе (*дзвынкаць*, *дзверы*), але ў дадзеным выпадку размываюцца межы паміж часткамі кампазіта, што перашкаджае правільнаму ўспрыманню слова. Такім чынам, размеркаванне звонкіх і глухіх фанем на месцы этымалагічнага **[д]** перад наступнымі звонкімі на сандхіяльных стыках адбываецца пераважна па законах унутрыслоўнага сандхі.

У беларускай мове з санорнымі могуць спалучацца звонкія і глухія зычныя. Спалучэнні *дв*, *тв*, *дм*, *тм*, *др*, *тр* ужываюцца як у корані слова, так і на марфемных швах (*двойка*, *выглядваць*, *твар*, *выблытвацца*, *гетман*, *падмануць*, *кадмій*, *адрынуты*, *дрымота*). У абодвух выпадках першы зычны захоўвае сваю якасць. Аднак даследаваны матэрыял паказаў, што гэтае правіла не дзейнічае для сандхіяльных стыкаў, дзе канцавы змычны часткі слова з пабочным націскам можа рэалізоўвацца як па правілах аглушэння звонкага на канцы слова, так і па правілах унутрыслоўнай фанетыкі з захаваннем якасці зычнага. Гэта залежыць ад сілы праяўлення дэлімітатыўнасці на стыку асноў, г. зн. ад таго, ці ўсведамляюць носьбіты мовы мяжу паміж кампанентамі, а калі ўсведамляюць, то як яе ўспрымаюць – як унутрыслоўную ці як міжслоўную [4, с. 125]. Як і меркавалася, большая ступень спаянасці кампанентаў была характэрна для лексічна асвоеных слоў са злітным напісаннем. Пры іх начытванні інфарманты не рабілі паўзы паміж асновамі і аддавалі перавагу звонкай парнай фанеме (*ме[др]аботнік* – 67% рэалізацый, *ме[тр]аботнік* – 33%; *фель[дм]аршал* – 77%, *фель[тм]аршал* – 23%; *бран[дв]ахта* – 55%, *бран[тв]ахта* – 45%). У той жа час пры вымаўленні слоў з абмежаваным ужываннем, арфаграфічна аформленых праз злучок, часта рабілася паўза (11 выпадкаў для лексемы *брэйд-вымпел* і 14 – для *брэнд-менеджмент*), а канцавы змычны першай асновы губляў сваю якасць (70% **[т]**-рэалізацый для *брэйд-вымпел* і 90 – для *брэнд-менеджмент*).

Законы ўнутрыслоўнага сандхі дзейнічаюць пры спалучэнні звонкага **[д]** з наступнымі глухімі на стыку асноў кампазітаў. Вымаўленне глухога змычнага было зафіксавана ў 100% выпадкаў для наступных лексем: *медкамісія*, *медперсанал*, *гранд-прэмія*, *разведшкола*, *слайд-шоу*, *бандфарміраванне*, *гранд-фінал*. Многія словы ўяўлялі для інфармантаў арфаэпічную складанасць, паколькі на сандхіяльным стыку ўзнікалі нехарактэрныя для беларускай фанетычнай сістэмы кансанантныя групы: **[нтп]**, **[йтш]**, **[нтф]**, **[нтф’]**. Аднак гэта не паўплывала на паслядоўную рэалізацыю асіміляцыйнай глухасці, не выклікала спрашчэння названых груп зычных.




Мал. 2. Асцылаграма слова *разведзводка* з афрыкатай [дз]

Адзінкавыя выпадкі раздзельнага вымаўлення аналізуемых слоў заканамерныя ў дадзенай фанетычнай пазіцыі і не ўплываюць на вынікі даследавання.

Лексема *сэканд-хэнд* дэманструе яшчэ адно неўласцівае беларускай мове спалучэнне зычных – **[нтх]**. Змычны пры начытванні аглушаўся рэгулярна, пры гэтым 32% інфармантаў рэалізавалі спрошчаны варыянт дадзенага спалучэння – **[нх]**: *[сэканхэнт]*.

У выніку спалучэння на сандхіяльным стыку звонкага змычнага **[д]** і глухога змычнага **[т]** (лексема *будтрэст*) пры злітным вымаўленні ўтвараецца гук, які ўспрымаецца як падоўжаны глухі змычны **[т:]**. Яго якасць пацвярджаецца данымі асцылаграфічнага аналізу: даўжыня глухой змычкі значна павялічваецца і складае ў сярэднім 210 мсек. У той жа час зафіксаваны 3 выпадкі вымаўлення не аднаго падоўжанага зычнага, а двух ідэнтычных па структуры глухіх змычных. На асцылаграме ім адпавядае сегмент «глухая змычка – выбух – глухая змычка – выбух». Такая рэалізацыя не ўласціва натуральнаму маўленню і выклікана, хутчэй за ўсё, уплывам графічнага вобліку слова пры чытанні. Гэтае сцвярджэнне справядлівае і ў адносінах да 5 выпадкаў захавання якасці канцавога **[д]**: *бу[дт]рэст*. Штучнасць такога спалучэння пацвярджаецца тым, што двое інфармантаў вымаўлялі яго з рэдукаваным галосным, які і паспрыяў адсутнасці аглушэння.

Трохкампанентная кансанантная група *ндч*, прадстаўленая словам *гранд-чэмпіён*, не сустракаецца ў беларускай унутрыслоўнай фанетыцы. А спалучэнне *дч* часта ўжываецца на марфемных швах (*падчапіць*, *наладчык*) і арфаэпічна прадугледжвае рэалізацыю падоўжанага **[ч:]**. Пры аналізе вымаўлення кампазіта зафіксаваны наступныя ўзуальныя варыянты: *[γранчэмп'ійон]*, *[γрантчэмп'ійон]*, *[γранч:эмп'ійон]*, *[γрант чэмп'ійон]* і *[γранд чэмп'ійон]*. У большасці выпадкаў змычны **[д]** рэдуцыруецца і спалучэнне спрашчаецца да **[нч]**. Калі змычны прыпадабняецца да шчылінная па спосабу ўтварэння, гучыць падоўжаны **[ч:]**. Акустычна яго якасць пацвярджаецца наяўнасцю больш доўгай змычкі – у сярэднім 68 мсек. Гэты ж паказчык для непадоўжанага **[ч]** складае 40 мсек.

Для аналізу асаблівасцей гукавой рэалізацыі этымалагічнага **[д]** са шчылінным **[с]** былі ўзяты словы *рэдсавет*, *фельдсувязь*, *брандспойт*, *віндсёрфінг*. У першым з іх на мяжы кампанентаў прадстаўлена спалучэнне *дс*, характэрнае для ўнутрыслоўнага сандхіяльнага стыку. Арфаэпічна яно афармляецца наступным чынам: на стыку прыстаўкі і кораня – як **[тс]**, **[$т^с$с]** ці **[цс]**, на стыку кораня і суфікса – як **[ц]**. Варыянты *[рэтсав'эт]* і *[рэ$т^с$сав'эт]* рэалізавалі 68% інфармантаў, варыянт *[рэцсав'эт]* з поўнай заменай выбухнога на афрыкату – 32%. На асцылаграмах афрыката пазнаецца па кароткай змычцы і доўгім выбухным сегменце.

У трох астатніх лексемах прадстаўлены кансанантныя групы, не ўласцівыя беларускай мове: **[л'тс]**, **[нтсп]**, **[нтс']**. У сувязі з гэтым іх вымаўленне, як і можна было прадбачыць, мае пэўныя асаблівасці. Так, зафіксаваны наступныя варыянты рэалізацыі слова *фельдсувязь*: *[ф'эл'тсув'ас']*, *[ф'эл'цсув'ас']*, *[ф'эл'дсув'ас']*, *[ф'эл'т сув'ас']*, *[ф'эл'д сув'ас']* і *[ф'эл'сув'ас']*. Вымаўленне слова *брандспойт* усімі інфармантамі суправаджалася афрыкацыяй або пропускам змычнага гука – *[бранцпойт]*, *[бранцспойт]*, *[бранспойт]* і *[бранс пойт]*. У слове *віндсёрфінг*, наадварот, афрыкацыі змычнага не зафіксавана, сустракаліся толькі выпадкі рэдукцыі змычнага або санорнага: *[в'інтс'орф'інх]*, *[в'інс'орф'інх]*, *[в'ітс'орф'інх]* і *[в'іт с'орф'інх]*.

**Заключэнне**. Праведзенае даследаванне арфаэпічнай арганізацыі кансанантных спалучэнняў з пачатковымі звонкімі змычнымі дазволіла выявіць найважнейшыя фактары, якія ўплываюць на размеркаванне фанем у дадзенай пазіцыі. Сярод ***фанетычных*** фактараў найбольш істотным з'яўляецца фанетычнае акружэнне зычнага, якое выклікае дзеянне правіл асіміляцыі зычных па звонкасці / глухасці. За выключэннем адзінкавых выпадкаў, спалучэнні канцавога звонкага змычнага першай асновы з наступным глухім другой асновы афармляюцца па законах унутрыслоўнай фанетыкі з асіміляцыйнай глухасцю: *[вэп]старонка*. Яшчэ адзін уплывовы фанетычны фактар – наяўнасць на сандхіяльным стыку шматкампанентных кансанантных груп, не характэрных для фанетычнай сістэмы беларускай мовы. У такіх спалучэннях узнікаюць рознага тыпу спрашчэнні, якія аблягчаюць працэс артыкуляцыі і набліжаюць арфаэпічны воблік слова да больш прывычных носьбіту мовы гукавых рэалізацый. Так, у кансанантных групах зафіксаваны пропуск змычнага (*сэка[нх]энт*, на пісьме – *сэканд-хэнд*), санорнага (*ві[тс']орфінг*, на пісьме – *віндсёрфінг*).

***Лексічны*** фактар заключаецца ў ступені засвоенасці слоў і частотнасці іх ужывання. Можна з высокай доляй верагоднасці сцвярджаць, што найноўшыя запазычанні, а таксама словы з корпусу спецыяльнай лексікі будуць уяўляць для носьбіта мовы пэўную арфаэпічную цяжкасць. Гэта можа ўплываць на ўспрыманне сандхіяльнага стыку як міжслоўнага з адпаведным фанетычным афармленнем. Так, пры рэалізацыі агульнаўжывальнага кампазіта *медработнік* толькі 33% інфармантаў змянілі перад санорным якасць этымалагічнага звонкага [д] і вымавілі парны глухі [т], у той час як для запа-

зычанай лексемы *брэнд-менеджмент* гэты паказчык складае 90%.

Сярод ***граматычных*** фактараў рэлевантным для арфаэпічнага афармлення кампазітаў з'яўляецца ступень іх члянімасці, якая ў сваю чаргу ў многім залежыць ад спосабу іх утварэння. Пры словаскладанні часткі кампазітаў могуць ужывацца самастойна, а значыць, сандхіяльны стык часцей будзе ўспрымацца як міжслоўны (*брэнд-менеджмент, гранд-прэмія*). Асновы складанаскарочаных слоў самастойна не ўжываюцца, таму ступень іх дэлімітатыўнасці ніжэйшая (*рыбгас*).

## Літаратура


1. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І. Р. Бурлыка [і інш.]. Мінск: Навука і тэхніка, 1989. 335 с.
2. Слоўнік беларускай мовы / Н. П. Еўсіевіч [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2012. 916 с.
3. Падлужны А. І. Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы. Мінск: Навука і тэхніка, 1977. 168 с.
4. Русская фонетика в развитии: фонетические «отцы» и «дети» начала XXI века / Р. Ф. Касаткина [и др.]. М.: Яз. слав. культуры, 2013. 458 с.


## References


1. Burlyka I. R., Vygonnaya L. Ts., Losik G. V., Padluzhny A. I. *Fanetyka belaruskay litaraturnay movy* [Belarusian standard language Phonetics]. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1989. 335 p.
2. Eusievich N. P., Kandratsenya I. U., Kirdun A. A., Kuntsevich L. P., Ulasevich V. I., Chabatar N. A. *Slounik belaruskay movy* [Belarusian Dictionary]. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2012. 916 p.
3. Padluzhny A. I. *Narys akustychnay fanetyki belaruskay movy* [Essay of Belarusian language acoustic phonetics]. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1977. 168 p.
4. Antonova O. V., Kalenchuk M. L., Kasatkina R. F., Savinov D. M., Skachedubova E. S. *Russkaya fonetika v razvitii: foneticheskiye «ottsy» i «deti» nachala XXI veka* [Russian phonetics in development: phonetic «Fathers and Sons» of the beginning of the XXI century]. Moscow, Yaz. slav. kul'tury Publ., 2013. 458 p.


## Інфармацыя пра аўтара


**Мандзік Вераніка Аляксандраўна** – кандыдат філалагічных навук, навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, к. 2, Рэспубліка Беларусь). E-mail: vieron9@mail.ru


## Information about the author


**Mandzik Veranica Alyaxandrauna** – PhD (Philology), researcher, the Department of Modern Belarusian language. National Academy of Sciences of Belarus (1, ap. 2, Surganova str., 220072, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: vieron9@mail.ru


*Паступіў 10.02.2017*